А. А. Желтирова ; Оренбург. гос. ин-т искусств им. Л. и М. Ростроповичей. – Магнитогорск, 2009. – 27 с.

3. *Лебедев, А. Е.* Жанр концертной симфонии в современной музыке для баяна / А. Е. Лебедев // Вест. Челябинской гос. акад. культуры и искусств. – 2011. – № 1 (33). – С. 115–120.

4. *Лошков, Ю.* Академическое народно-инструментальное исполнительство: проблема самоидентификации / Ю. Лошков // Научный вестник Национальной музыкальной академии им. П. И. Чайковского : сб. научн. тр. – 2009. – № 82. – С. 14–22.

5. *Михайлова, А. А.* Фольклорные и неофольклорные стилевые тенденции в музыке отечественных композиторов для баяна / А. А. Михайлова. – М. : Композитор, 2010. – 134 с.

6. *Толкач, И. Ф.* Основные тенденции развития репертуара для народных инструментов Беларуси / И. Ф. Толкач // Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай культуры : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 23–24 лістапада 2011 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – С. 397–400.

***С. А. Паўлава,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай*
*дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў;*

***Н. А. Ляйко,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры інфармацыйных*
*рэсурсаў і камунікацый*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# САЦЫЯЛЬНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў СТРУКТУРЫ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАГА МЕНЕДЖМЕНТУ

Бібліятэчная і калябібліятэчная прастора – асноўны рэсурс функцыянавання сучаснай бібліятэкі. Працэсы асмыслення бібліятэказнаўцамі трансфармацыйных працэсаў у бібліятэчнай дзейнасці знайшлі сваё адлюстраванне ў розных падыходах, якія фарміруюць метадалагічную базу сучаснага бібліятэказнаўства.

У кантэксце заяўленай тэмы мы разгледзім кіраванне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю з пазіцыі сацыяльна-тэхнала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гічнага падыходу. Ён дазваляе выкарыстоўваць прыёмы і спосабы актыўнага ўздзеяння на сацыяльныя сістэмы розных маштабаў і ўзроўняў арганізацыі, улічваць разнастайнасць унутраных і знешніх сувязей сацыяльных з’яў у межах бібліятэкі, шматварыянтнасць і натуральнасць іх змяненняў. Вобласць выкарыстання сацыяльных тэхналогій у кіраванні бібліятэкай вельмі шырокая, і як з’ява яшчэ да канца не асмыслена спецыялістамі. Відавочна, што сацыяльна-тэхналагічны падыход раскрывае бібліятэчную дзейнасць у гуманітарным аспекце: яе асноўнае прызначэнне – вядзенне дыялогу бібліятэкі з карыстальнікам і грамадствам увогуле.

З пазіцый сацыяльна-тэхналагічнага падыходу ўстойлівасць бібліятэчнай сістэмы абумоўліваецца ўзроўнем развіцця сацыяльных камунікацый бібліятэкі, якія фарміруюць яе ўнутранае і знешняе палі, і ўкараненнем інавацыйных сацыяльных тэхналогій, якія дазваляюць мадэрнізаваць сістэму і адаптаваць яе пад грамадскія патрэбы.

Ва ўсіх вышэйназваных працэсах кіраўнічай дзейнасці належыць асобная роля, г. зн. што навуковае кіраванне як дзейнасць пачынаецца з тэарэтыка-канцэптуальнага абгрунтавання мэтаў і чакаемых вынікаў, а завяршаецца практычным вопытам і яго абагульненнем, ацэнкай. Паміж імі распасціраецца поле мысліцельных, пазнавальных, арганізацыйна-кіраўнічых дзеянняў-праграм або ступеняў суб’ектывізацыі тэарэтычнай канцэпцыі і аб’ектывізацыі практычнага вопыту. Высокі ўзровень навуковасці і выніковасці кіравання дасягаецца тады, калі на кожнай з гэтых ступеней, «крокаў» руху ад тэарэтычнай канцэпцыі да практыцы і наадварот – ад практычнага вопыту да новай канцэпцыі – задачам будуць забяспечвацца адпаведныя навуковы аналіз, ацэнка і карэктыроўка.

Кіраванне як працэс даследуецца многімі навукоўцамі, якія распрацавалі адміністратыўныя функцыі, у межах якіх рэалізуецца працэс кіравання. З пункту гледжання сістэмнага падыходу, кіраўнікі павінны разглядаць арганізацыю як сукупнасць узаемазвязаных элементаў (персанал, арганізацыйная структура, мэты, задачы і тэхналогіі, у тым ліку і сацыяльныя), якія забяспечваюць функцыянаванне ўсіх падсістэм сістэмы кіравання. Тэорыя і практыка сучаснага менеджменту з’яўляюцца інструментамі новых сацыяльных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адрозненні ад папярэдняй рацыянальнай канцэпцыі бібліятэчны менеджмент заснаваны на сучаснай парадыгме кіравання, якая характарызуецца наступнымі фактарамі: эфектыўным выкарыстаннем чалавечага патэнцыялу, якое скіравана на развіццё здольнасцей людзей да сумеснай дзейнасці, неаддзельнасцю арганізацыйнай культуры, заснаванай на сумленнасці і даверу да людзей; эвалюцыйным характарам развіцця сістэм і метадаў; прадбачаннем змяненняў, гнуткасцю кіраўнічых рашэнняў; прыярытэтам стратэгічнай арыентаванасці кіравання, што дазваляе выжываць і дасягнуць сваіх мэтаў у даўгачаснай перспектыве [4, с. 304]. У сучаснай канцэпцыі бібліятэчнага менеджменту няма абмежаванняў ідэялагічнага або вузкапрафесіянальнага характару. І ў гэтым сэнсе канцэпцыя бібліятэчнага менеджменту выступае тэарэтычнай асновай для выкарыстання ў кіраванні бібліятэкай дасягненняў многіх навук.

Сацыяльна-тэхналагічны падыход прадугледжвае ўключэнне бібліятэкі як сацыяльнай і вытворчай структуры ва ўсе грамадскія кантэксты з улікам разнастайнасці сацыяльных камунікацый, дзейнасць у межах гэтых працэсаў бібліятэкара і карыстальніка, што падкрэслівае гуманістычны змест гэтага падыходу, скіраванага на задавальненне патрэб людзей. Гэта абумоўлівае з'яўленне ў практыцы дзейнасці бібліятэк інавацыйных сацыяльных тэхналогій у сістэме менеджменту: выкарыстанне маркетынгавай канцэпцыі ў бібліятэчнай практыцы заснавана на выяўленні асобнага роду тэхналогій сацыяльнага ўздзеяння як падсістэмы сістэмы сацыяльных тэхналогій. Маркетынгавыя тэхналогіі ўплываюць як на паводзіны бібліятэкара і чытача, так і бібліятэкі – на сацыяльную сістэму. Трэба адзначыць, што бібліясацыялогія – адносна новы навуковы накірунак у сістэме менеджменту, прадметам якога з'яўляюцца сацыяльныя тэхналогіі. Канцэпцыя бібліясацыялогіі была распрацавана Р. А. Трафімавай [7, с. 165]. Аўтар указвае, што яе трэба лічыць самастойнай дысцыплінай, галіной сацыялогіі, якая вывучае розныя бакі бібліятэчнай справы як сацыяльнага інстытута.

Найбольш актуальным навуковым кірункам можна лічыць сацыялогію бібліятэчнага менеджменту. Сучаснае канцэптуальнае бачанне праблем сацыялогіі бібліятэчнага менеджменту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абумоўлена тым, што яе галоўнаму аб’екту – кіраўнічай дзейнасці – належыць важная роля ў цывілізацыйных працэсах. Значнасць сацыялогіі менеджменту заключаецца ў тым, што яе можна разглядаць не толькі як вучэбную і навуковую дысцыпліну, але і як магчымы (пры адпаведных якасцях) праект навукова абгрунтаванай праграмы развіцця бібліятэчнай сферы. Пытанні ўкаранення сацыяльных тэхналогій у дачыненні да сацыялогіі менеджменту дастаткова поўна разглядае адзін з буйнейшых спецыялістаў у вобласці сацыялогіі член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук Ж. Т. Тошчанка, які вылучыў змястоўныя кампаненты сацыяльных тэхналогій, распрацаваў, сканструяваў і рэалізаваў патрабаванні да сацыяльнай тэхналогіі [6]. Вялікую ўвагу аўтар надае праблеме «работы» сацыяльных тэхналогій на перспектыву, што закладаецца ў стратэгічным бібліятэчным менеджменце і адаптавана да яго.

У сістэме сацыяльных тэхналогій, на наш погляд, важнае месца займаюць тэхналогіі паблік рылейшнз (ПР), якія з’яўляюцца, у першую чаргу, камунікатыўнымі тэхналогіямі. ПР з’явіўся першапачаткова як сукупнасць прыёмаў, якія забяспечваюць сацыяльную падтрымку, але вельмі хутка перарос межы маркетынгу і аформіўся як самастойная функцыя сучаснага менеджменту, якая пранізывае і падтрымлівае ўсе падсістэмы менеджменту. ПР уяўляе шматгранную, развіваючую з’яву, што сведчыць аб разнастайнасці вызначэнняў гэтага паняцця. Таксама неабходна адзначыць, што дакладнага, адназначнага і лаканічнага вызначэння ПР пакуль няма, гэта гаворыць аб тым, што межы яго дзейнасці яшчэ да канца не вызначаны [3, с. 5–17], зараз існуе больш за 500 фармулёвак гэтага паняцця. Іх можна структурыраваць на аснове камунікатыўнага, функцыянальнага (тэхналагічнага), псіхалагічнага, кіраўнічага, маркетынгавага, комплекснага падыходаў. Камунікатыўны падыход акцэнтуе ўвагу на тым, што ПР – гэта камунікатыўная тэхналогія, якая скіравана на арганізацыю асяроддзя ў межах камунікатыўнай прасторы. Пры функцыянальным (тэхналагічным) падыходзе акцэнт у вызначэннях робіцца на асноўных функцыях ПР як практычнай дзейнасці: «практыка», ПР – гэта творчы і сацыяльна-навуковы падыход да аналізу тэндэнцый, прадказання іх вынікаў, прадстаўлення кансультацыі кіраўнікам арганізацый і выканання запланаваных праграм



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеянняў, якія будуць служыць інтарэсам арганізацый і грамадскім інтарэсам. Псіхалагічны падыход у большай ступені звязаны з мастацтвам стварэння ўстойлівай рэпутацыі, іміджу арганізацыі. Кіраўнічы падыход акцэнтуе ўвагу на тым, што ПР разглядаецца як спецыялізаваны і прафесіянальна арганізаваны менеджмент, тэхналогія інфармацыйнага кіравання, самастойная функцыя менеджменту па ўстанаўленні і падтрымцы камунікацый паміж арганізацыяй і грамадскасцю [1, с. 7]. Маркетынгавы падыход дае ўяўленне аб наладжванні сувязяў з вызначынымі групамі грамадкасці для атрымання камерцыйных або іншых выгад. Комплексны падыход вызначае ПР як навуку і мастацтва дасягнення гармоніі сродкам узаемапаразумення, заснаванага на дакладнай і поўнай інфармацыі [2, с. 15]. Усе вызначэнні не з’яўляюцца канчатковымі таму, што ПР – гэта сфера, якая пастаянна развіваецца, а разнастайнасць вызначэнняў гаворыць аб разнастайнасці падыходаў да ПР. Але пры ўсёй разнастайнасці, многія трактоўкі маюць агульныя моманты: апісываюць партнёрскую дзейнасць, скіраваную на стварэнне добразычлівых адносін паміж рознымі асобамі і арганізацыямі ў мэтах рэалізацыі вызначынай задачы.

Аналіз шматлікіх вызначэнняў ПР дазваляе прапанаваць найбольш прыемлемым наступнае ПР – самастойная функцыя менеджменту па ўстанаўленні і падтрымцы камунікацый паміж арганізацыяй і грамадскасцю. Прапанаванае вызначэнне падразумявае форму кіравання грамадскімі сувязямі і структуру, прызваную займацца арганізацыяй гэтых адносін. Гэта значыць, што грамадскія сувязі рэалізуюцца праз структуру паблік рылейшнз. Структура – кіраўнічы элемент інфармацыйнага менеджменту. Бясспрэчна, што ПР па сваёй сутнасці ўяўляе кіраўнічую дзейнасць, звязаную, з аднаго боку, з камунікацыямі, па якіх распаўсюджваецца інфармацыя як сродак рэгулявання адносін паміж уладай і грамадствам, бізнесам і грамадствам, бізнеса і культуры, як асноўных сфер чалавечай дзейнасці, а з другога боку – з перадачай нейкіх пасланняў у знешні свет. І таму, безумоўна, ён перасякаецца з паняццем «інфармацыйны менеджмент», г. зн. са стратэгіяй кіравання бібліятэкай і прасторай вакол яе з дапамогаю інфармацыі. Але задачы ў іх розныя. У менеджменце стаіць задача рэалізаваць стратэгію кіравання, а ў ПР – стварыць атмасферу спрыяння працэсу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абмену інфармацыяй і каштоўнасцямі з мэтай падтрымцы і рэгулявання адносін у сферы палітыкі, эканомікі, культуры, з мэтаю сацыялізацыі чалавека і ўздзеяння на яго, з мэтай сацыяльнага кантролю мас для забеспячэння раўнавагі сацыяльных сістэм [3, с. 150].

Бібліятэкарам неабходна асэнсаваць ПР як функцыю кіравання, якая ў сістэме менеджменту павінна мець сваю структуру, звярнуць увагу на праблемы, пошукі новых форм вывучэння чытача і чытання; на засваенне менеджменту і маркетынгу як сучасных канцэпцый кіравання бібліятэкай; на сувязь з грамадкасцю і роля сподкаў масавай інфармацыі; на прыцягненне супрацоўнікаў да кіравання бібліятэкай і інш.

---

1. *Алёшина, И. В.* Паблик рилейшнз в менеджменте и маркетинге / И. В. Алёшина // Маркетинг. – 1996. – № 3.– С. 108–111.

2. *Блэк, С.* Паблик рилейшнз. Что это такое? / С. Блэк. – М. : Новости, 1990. – 240 с.

3. *Иванченко, Г. В.* Реальность Паблик рилейшнз / Г. В. Иванченко. – М. : Смысл, 1999. – 153 с.

4. *Коротков, Э. М.* Концепция менеджмента / Э. М. Коротков. – М. : ДеКа, 1997. – 304 с.

5. *Макаревич, Э. Ф.* Общественные связи : монография / Э. Ф. Макаревич. – М. : ТВ-ПрессАгенство «Графилья Толстой». – 1998. – 310 с.

6. *Тощенко, Ж. Т.* Социология. Общий курс. / Ж. Т. Тощенко. – 3-е изд. – М. : Прометей : Юрай, 1998. – 511 с.

7. *Трофимова, Р. А.* Библиосоциология: научный статус, методология и методика / Р. А. Трофимова ; науч. ред. Ю. В. Растов. – Барнаул : Изд-во Алт. ун-та, 2002. – 439 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ